# ПАБОЧНЫЯ СЛОВЫ, СПАЛУЧЭННІ СЛОЎ І СКАЗЫ

**Асноўныя паняцці:** пабочныя словы, спалучэнні слоў і сказы, роля пабочных канструкцый у сказе, значэнні пабочных канструкцый, спосабы іх выражэння.

**1. Прачытайце сказы. Знайдзіце пабочныя словы, спалучэнні слоў і сказы і вызначце іх адметныя адзнакі.**

1. Бураў, аднак, маўчаў, толькі здрыгануўся целам і вуркотна-ціха стагнаў (В.Б.). 2. Бадай, адзіным шчасцем Алеся было тое, што для бацькі гісторыя рода і геральдыка былі яшчэ больш нудныя, чым для яго (Каратк.). 3. Тапелец, адчуўшы дапамогу, адчайна рвануўся, галава яго выскачыла на паверхню, і ён, нарэшце, глынуў паветра (Іпат.). 4. Бураў, відаць было, неяк утаймаваў свой боль, расплюшчыў вочы, паўзіраўся між цёмных хваін у трохі святлявае начное неба (В.Б.). 5.Здавалася, школа сама радавалася нашаму святу і з нецярпеннем чакала сваіх гаспадароў (Ткач.). 6. Сушчэня ўстаў, хацеў нешта сказаць, мабыць, на развітанне (В.Б.). 7. У Юравічах, як вядома, выяўлена стаянка чалавека каменнага веку, самая старажытная ў Беларусі (Сач.). 8. Рака Нараў свой выток бярэ на паўночным усходзе пушчы і перасякае ўвесь лясны масіў. Ясельда, наадварот, імкне направа, з пушчы, у кірунку Бярозы і Целяхан (Пархі.). 9. Ён [Адам Міцкевіч] служыў не народу, а дзяржаве, ці, дакладней, палітыцы, да якой імкнулася дзяржава. Яго ж, пэўна, прываблівала дарога, працярэбленая папярэднікамі, а нашыя ж Багушэвіч з Купалам усё чэрпалі з саміх сябе, і таму іхнія творы, праўда, няроўныя, часам слабыя, але разам з тым, як слушна заўважае Вавенарг пра тых самых першых, поўныя Боскай геніяльнасці (Ад.).

**2. Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце пабочныя словы і спалучэнні слоў. Назавіце часціны мовы, якія ўжываюцца ў ролі пабочных слоў і спалучэнняў.**

1. Ласёў як помніцца развялося шмат, і яны ўжо не баяліся чалавека, бо прывыклі да шуму і гоману ў наваколлі (Гардз.). 2. Пушча вабіла Петруся не толькі сваімі звярамі. Ёй здавалася не было канца-краю (Хадк.). 3. Усюды было пуста, ды і дымам быццам перастала патыхаць можа перамяніўся вецер? (В.Б.). 4. Пякло праўда не толькі ногі, а болей галаву і плечы (В.Б.). 5. Пад крылом самалёта – зямля, якая па-новаму хоча радзіць, над якой зазвінела нарэшце шчаслівая песня сапраўднай, мірнай вясны (Б.). 6. Як вядома шчасце – паняцце адноснае (Карп.). 7. Надумаўся ён [Сцёпка] за навуку сур’ёзна ўзяцца. Але як? Часу няма і самае галоўнае – няма кніжак (К-с). 8. Мабыць цяпер нават не пералічыш, колькі з роднага паселішча выйшла настаўнікаў, урачоў, розных інжынераў...(І.Н.). 9. Адразу даверыцца ён [камандзір] вядома не мог: вопыт падказваў, што сляпое давер’е часам вельмі дорага каштавала партызанам (Кул.). 10. Мабыць памыляюцца тыя паэты і пісьменнікі, якія бачаць у восені толькі адно заміранне жыцця. Здаецца ўсё ідзе якраз наадварот (І.Н.). 11.Веры безумоўна найбольш імпанаваў Андрэй Шыбянкоў, але яна ні ў чым гэтага не выяўляла (М.З.). 12. Ля многіх хат высяцца тэлевізійныя антэны. Гаманлівыя купкі жанок ля калодзежа. Адным словам звычайная беларуская вёска (В.Р.). 13. Відаць жа на шчасце не ўсцешана сэрца трывогамі дробных будзённых згрызот, калі так узрушана б’ецца і рвецца туды, дзе здаецца кіпіць гарызонт (Гіл.). 14. У адрозненне ад літаратуры, якая імкнулася абсмяяць працоўнага беларуса, прынізіць яго чалавечую годнасць або наадварот намаляваць яго саладжава-сентыментальным мужычком, Купала і Колас паказалі сапраўды нацыянальны характар народа, раскрылі нам нязмерныя багацці народнай душы (Віт.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Спішыце, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце пабочныя словы, спалучэнні слоў і ў дужках пасля кожнага сказа адзначце, да якой групы адносіцца пабочнае слова ці спалучэнне згодна іх значэнню.**

I. 1. Весніцы на шчасце былі незамкнёныя, і Ірына выбегла на дарогу, у лес (З.П.). 2. Я ў лузе кветкі не сарваў ніводнай, ніводнай зоркі з неба не схапіў і па жаданні прымаўкі народнай ні разу іх каханню не дарыў (А.К.). 3. З усяго палявання Васько бадай больш за ўсё любіў гэтыя ранішнія зборы (Асіп.). 4. Здавалася і вайны не было ўжо. Мірным сном спалі людзі пасля цяжкай працы (Пальч.). 5. – Па-першае там [у клубе] ёсць некалькі сімпатычных туземак – з лёгкай рукі Алеся туземкамі мы называем тутэйшых вясковых дзяўчат, -- а па-другое адна з іх ужо цікавіцца табою (З.П.). 6. Ніхто па сутнасці не чуў трывожных сірэн: уся вёска спала глыбокім сном (В.Б.). 9. – Калі ласка пастукайце ў кабіну! Я тут, на мосце, злезу, -- папрасіў свайго суседа Рокаш (Гр.). 10. Бывала узыдзеш на гару – і перад табою раптам разгорнецца шырокі краявід (Гр.). 11. Магчыма прычынаю асцярожнасці калгаснікаў было тое, што ўсяго тры гады назад ваўкі сярод дня разарвалі тут лесніка (Шам.) 12. Не спалася мне прызнацца трохі і ад таго, што я неяк дзіўна, бескантрольна пабойваўся, што і лес, чаго добрага, можа загарэцца, калі пакінуць вогнішча адно, што і надысці хто-небудзь можа на сонных ды насмяяцца (Б.). 13. На любое пытанне я атрымлівала ад таты грунтоўны і галоўнае зразумелы адказ (Морк.).

II. 1. Сон аднак не ішоў. Думалася пра дачку (З.П.). 2. Ён [войт] нарэшце выпрастаўся і закрычаў ужо грозна, як прызвычаіўся за шмат гадоў вайтоўства (Гар.). 3. З кустоў з аглушальным шумам сарваліся дразды-рабіннікі: відаць прыляталі сюды ласавацца ўжо добра налітымі ягадамі рабіны (М.Д.). 4. Па гэты бок ракі быў ужо другі свет прынамсі не бухалі, скалынаючы зямлю, бомбы (Чыгр.). 5. Я вядома з дарагой душой быў бы рад памагчы, але як назло як толькі выязджаў з вёскі, у штодзённай мітусні і клопаце забываўся на просьбу старой... (Сач.). 6. Я спытаў у маці, што са старою, чаму яна як бывала не наведалася да нас. І пачуў: яе няма ўжо на белым свеце... (Сач.). 7. Багушэвіч здолеў прымусіць па-новаму загучаць беларускую мову... Гэта трэба думаць каштавала яму найвялікшых намаганняў (Стр.). 8. У Лынькова было яшчэ адно як кажуць хобі: ён любіў фатаграфаваць праз агонь (Скр.). 9. Мы напэўна ж ведаем, як ярка і жоўта, прыемна і поўнагалоса пахне зацвілы асот, але для нас гэта – пустазелле (Я.С.). 10. Аказваецца крот жыве і зімою. І не толькі жыве, але і робіць наканаваную лёсам нялёгкую земляную работу (Сач.). 11. Памятаю як прыходзіла зіма ў гады майго маленства (З.А.). 12. У нетрах нашай рэспублікі геолагі выявілі вугаль, гаручыя сланцы, фасфарыты... Адным словам зямля, па якой мы ходзім, на якой мы жывём, вельмі багатая (Шым.). 13. Па сутнасці ўсё мястэчка было там, на гары, якую абляпілі вясёлыя домікі (Скр.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**4. Вызначце, у якіх сказах выдзеленыя словы з'яўляюцца пабочнымі, а якія – членамі сказа. Спішыце сказы, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.**

1. Для чалавека, не знаёмага з электратэхнікай, работа **здавалася** зусім нецікавай: ні рытму ў ёй, ні фізічнага напружання, ні цікавых аперацый (Шам.). 2. Стол **пэўна ж** яшчэ не забыўся, як мой бацька пачынаў новы каравай: нейкая ўрачыстасць прасвятляла ў тую хвіліну бацькаў твар (Я.С.). 3. Лось прыбіўся сюды аднекуль здалёк **відаць** з Амелькаўскіх лясоў (М.Д.). 4. Раніца першага верасня выдалася хмурная і халодная, **аднак** гэта не псавала агульнага радаснага настрою (Шам.). 5. Летняе неба **здавалася** ніжэй звесілася над зямлёю і ўзіралася ў яе тысячамі бліскучых вачэй (К-с). 6. Між іншым, гэта **бадай** адзіны выпадак, калі Іван Свірыдавіч сказаў пры мне так вось адкрыта, як пісалася ў лістоўках (Шам.). 7. І толькі калі **нарэшце** пачуўся гул машын і з-за дрэў зачарнела асфальтавая стужка, Ірына спынілася, абяссілена прыхінулася плечуком да шурпатага ствала сасны (З.П.). 8. Буйныя, лапушыстыя **пэўна** не тапатаныя нагой чалавека, узгадаваныя вялікаю шчодрасцю прыроды мільёны кветак пераліваліся ўрачыстай чырванню, ціха варушыліся на слабым ветрыку і імкнулі далёка ўніз (В.Б.). 9. З вялікіх асветленых акон грыміць радыё, праз белую павалоку фіранак **відаць** зеляніна вазонаў...

(Б.). 10. Данік **аднак** не вытрымаў. Упаў на адно калена за кустом і даў доўгую чаргу па фашыстах (Шам.). 11. Сёння я **нарэшце** ўбачыў, як працавалі бабры (В.В.). 12. Першае і **бадай што** галоўнае, неабходнае чалавеку, калі ён астанецца зімою начаваць у лесе, – гэта агонь (Сач.). 13. Зараз азярцо пакрыта тонкім лёдам, прысыпана сняжком і **здаецца** раўнюткім полем (Парх.). 14. Блакітная дарога да Дняпра! Вася **здаецца** яшчэ не так даўно і плавае на Прыпяці, а ўжо моцна палюбіў гэтую раку (Крауч.).

**5. Спішыце сказы, падбярыце да іх пабочныя словы, спалучэнні слоў, сказы. Заўважце, як пры гэтым змяняецца значэнне сказаў. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.**

1. Некалі, дзяўчом ... была падцыглястая, лупаценькая, а цяпер ... як вылюдзела! (Дал.). 2. Усе гэтыя сумнені ... хутка развеяліся: Людвік аказаўся вельмі простым, шчырым і таварыскім чалавекам (Кул.). 3. Хатынь... Мала хто чуў ... гэтую назву да вайны (Мач.). 4. “... гэта і ёсць тая краля, за якою так падаюць усе хатовіцкія кавалеры”, -- падумаў Лабановіч (К-с). 5. Бы чаго шукаючы, жанчына падоўгу і пільна аглядала нават самыя ... нязначныя экспанаты, узіралася ў кожны здымак (Сач.). 6. Красу петушынага голасу я ведаў ... ад жаваранка і шпака. Не лічачы ... спевакоў ледзь не хатніх – пеўня ці ластаўку або выпадковых – шчыгла ці чачотку (Б.). 7. Ягаднікі ... хутка жухлі, птушкі адляталі ў вырай, воўк выганяў зайца з гэтай дзялянкі, а мядзведзь, ababраўшы маліну, ішоў далей у тайгу (Я.С.). 8. ... яшчэ ні разу яны [байцы] не траплялі ў такое цяжкае становішча (Крауч.). 9. Якуб Колас і Янка Купала даказалі: ... ёсць такі народ, калі ён нараджае геніяў, патрэбна такая мова, калі на ёй можна ствараць шэдэўры (Бур.). 10. Іншы раз загадае брыгадзір падвезці да трактара ... вазоў шэсць бульбы-насенкі, Аркадзь падвязе не марудзячы (Грод.). 11. Ведаючы ... сынаў характар, спрачацца не стала (З.П.). 12. Праз сотні год жылі мы так, не даючыся нікому; але ... перамаглі нас палякі і запанавалі ў нашай беларускай староньцы (Багд.). 13. Упершыню княжыч не адчуваў да суперніка злосці ... нейкую палёгку (Іпат.).

С л о в ы  д л я  д а в е д а к: *як помню, глядзі ты, здавалася, напрыклад, на шчасце, напэўна, мусіць, перш за ўсё, праўда, вядома, сапраўды, бадай, урэшце, наадварот, аднак.*

**6. Спішыце. Падкрэсліце пабочныя словы, спалучэнні слоў і сказы. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку і растлумачце іх.**

1. Сонца было ўжо нізка. Яно падалося села на прыгнутую, далекаватую ад мяне травіну, якая спружыніста сагнулася ад гэтага яшчэ болей (Я.С.). 2. Хоць быў канец сакавіка, а сонца пякло, як у маі, і “ўкраінскі” ветрык як тут называлі вецер з поўдня прыносіў духмяную цеплыню сапраўднай вясны (Шам.). 3. Мушу прызнацца я часта бянтэжыўся, адстаючы ад яго [Брыля] у чытанні, канспектаванні (Калес.). 4. Манастыр, заснаваны ў сівую мінуўшчыну, быў як вядома адным з цэнтраў асветы і нацыянальнай культуры, ён нават у змрочныя, жудасныя гады турэцкай няволі карыстаўся некаторымі прывілеямі (Сач.). 5. Памыляюцца як лічыў ён [Шырма] тыя кампазітары, якія думаюць, што слова ў песні мае другараднае значэнне – была б толькі прыгожая, кранальная і запамінальная мелодыя (Гіл.). 6. Увесь прастор як нам тады здавалася напаўняўся спевамі і музыкаю, такою музыкаю, што ніякія музыкі на свеце не маглі яе пераняць (К-с). 7. Цягнік вельмі спяшаўся: мусіць разумеў, што сярод пасажыраў многа людзей, якім не цярпіцца хутчэй даехаць да сваіх вёсак (Я.С.). 8. Пад крылом самалёта – зямля, якая па-новаму хоча радзіць, над якой зазвінела нарэшце шчаслівая песня сапраўднай, мірнай вясны (Б.). 9. Сцены былі яшчэ не патынкаваны, і як казала мачыха зімой у хаце было – хоць ваўкоў ганяй (Саб.). 10. Калі для прыкладу ўзяць ды паставіць побач леташнюю вясну і цяперашнюю, дык гэта – неба і зямля (Кул.). 11. Эх, а ўсё ж прыгожая гэтая рака Прыпяць! Праедзь па ёй памалу раз-другі скажам хоць бы ад вусця да Пінска, і на ўсё жыццё запомніш і яе ціхія люстраныя плёсы, і таямнічыя старыцы… (Крауч.). 12. Красніцкая вуліца зімою заўсёды прыгожая, а ў такія дні – з інеем і чыстым снегам, Ціт

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бывала любаваўся ёю (Я.С.). 13. Паводле думкі мастацтвазнаўцаў найбольш цікавымі з'яўляюцца агоўскія куфры (У.Я.).

## УСТАЎНЫЯ СЛОВЫ, СЛОВАЗЛУЧЭННІ І СКАЗЫ

**Асноўныя паняцці:** устаўныя словы, словазлучэнні і сказы, сэнсавая функцыя ўстаўных канструкцый у сказе.

**1. Знайдзіце ўстаўныя словы, словазлучэнні і сказы і вызначце іх адметныя адзнакі.**

1. Траўка вылезла ў канаўцы, а ў бары – чуваць за мілі – музыканты-выканаўцы конкурс майскі аб'явілі (Гіл.). 2. На гэтых векавых дубах – так павялося ўжо спрадвеку, з незапоўных часоў – на Купалле вешалі качэлі (Сач.). 3. На камяніцы (гэта, можна сказаць, не была ўжо камяніца) добра расло, добра спела і добра павінна было прыбрацца з поля пад працавітымі рукамі гэтай сям'і (К.Ч.). 4. Цяпер вось нізам сцелецца верас у румяным ранішнім святле, а над верасам – таксама ў сонцы – густа высяцца гонкія сосны (Б.). 5. Яны [сосны] (вялікія і меншыя) адчайна чапляюцца за абрыў, а потым усё ж такі падаюць (Б.). 6. Шырокі дыяпазон жыццёвага матэрыялу (гістарычнае мінулае, Айчынная вайна, першыя пасляваенныя гады, сучаснасць), жанравая шматстайнасць – раман, аповесць, апавяданне, мініяцюра – свежасць і разнастайнасць апавядальнай манеры, дзе найбольш пашырана апавяданне ад першай асобы, -- усё гэта ўласціва Сачанку-празаіку (Андр.). 7. Двое маленькіх буслянятак ( яны нагадвалі падушачкі ў чорных навалачках) былі відаць у гняздзе (Хадк.) 8. А недзе ў самым пачатку сорак пятага, у першую – пасля трох гадоў акупацыі – спакойную зіму, я прынёс з вясковай хаты-чытальні новы зборнік ужо знаёмага мне аўтара "Астап" (Гіл.). 9. Начлежнікі ехалі ціха. Толькі фыркалі – знак, што будзе добрая дарога, -- ды ўразнабой тупалі коні, часам дзе цюкнуўшы падковай аб камень (Ад.). 10. Потым паехалі паплавамі ўздоўж Папараці. Тут травы ніхто не касіў – занадта далёка было, -- і коні хаваліся ў ёй вышэй за жывот (Каратк.).

**2. Знайдзіце ўстаўныя канструкцыі і вызначце іх структуру (слова, словазлучэнне, спалучэнне слоў, сказ).**

1. Зварот пісьменніка да падзей мінулага(і далёкага, і больш блізкага), пастаянная ўвага да сучаснасці дазваляюць паказаць усю складанасць узаемаадносін чалавека з навакольным светам (Андр.). 2. Усю ноч Раман не звёў ні на валасок вачэй. А ледзь пасвятлелі ў хаце вокны, узяў са сцяны дубальтоўку (ён, па даўнішняй завядзёнцы палешукоў, таксама меў сваю "ламачыну" – так, на ўсякі выпадак, хай будзе) і заспяшаўся ў лес (Сач.). 3. Ды і ботаў салдат не насіў да войска, а гэтыя, як надзеў (цяжкія кірзачы, з нягнуткімі халявамі), дык не знімаў другі год (В.Б.). 4. Раскладалі агонь і без Лынькова, але што гэта быў за агонь – адна смехата! – на яго мала хто і збіраўся (Скр.). 5. А як умелі беларусы складаць песні! То журботныя (праца на пана з цямна да цямна), то ўрачыста-раздольныя (подзвігі герояў, што ішлі на смерць у жорсткай бітве), то віхурна-вясёлыя (свята, каханне, шчасце) (М.Г.). 6. Любіць прызначана мне лёсам. Я не памру, пакуль люблю. І крык свой сціплы, безгалосы – паэта голас – не згублю (Пісьм.). 7. Пакінуўшы ўсё на Кандрата ("Калі не знойдзеш падводы – накрыеш бульбу бадыллем"), Марыля разам з Соняй подбежкам падаліся дахаты (З.П.). 8. Тое, што ў савецкай гісторыяграфіі прыглушалася, замоўчвалася, цяпер не затушоўваецца: Мяснікоў быў супраць надання Беларусі статусу суверэннай (нават фіктыўна!) рэспублікі (Мех.). 9. Было ціха, узыходзіла яркае сонца, а цеплыні не было – раніца займалася ядраная, халодная (не дзіва: другая палова жніўня) (Кір.). 10. І вось у адзін з дзён – стаяла сярэдзіна жніўня – бацька і маці нешта доўга шапталіся за вячэрай, а твары ў іх былі ўстрывожаныя і ўрачыстыя (Каратк.). 11. Скарына змяшчае – і не раз! – у сваіх выданнях (калі не богаслужэбных, то свяшчэнных традыцыйных кніг) не выяву легендарных святых, а ўласны партрэт (Шм.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. У намечаны дзень з маімі апенькамі (яны ўжо мелі сантыметраў па чатыры ў дыяметры) атрымаўся канфуз (Парх.).

**3. Спішыце сказы, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Высветліце сэнсавую функцыю ўстаўных канструкцый.**

1. Крокаў за паўтараста ад берага , мусіць, за адну ноч удзень дакладна не было іх з’явіліся акопы (Чыгр.). 2. Хаця па дыване салдат не хадзіў адзіны дыван у іхняй кватэры вісеў на сцяне (В.Б.). 3. Наўрад ці можна сумнявацца, што Скарына яшчэ ў Кракаве адным з тагачасных цэнтраў кнігадрукавання загарэўся ідэяй паставіць геніяльнае вынаходніцтва Гутэнберга на службу свайму народу (Гіл.). 4. Барвяны вялізны круг сонца за дрэвамі. Прыгожая, ласкавая і верыцца, што не скупая, бліскучая, жвавая рэчка (Б.). 5. На Халахонавым хацішчы некалі, ужо не за гэтым часам, жыў там адасоблена ад Верамеек багаты, але дужа нелюдзімы мужык Халахон Зазыба прапанаваў даць каню адпачыць, бо не было ратунку ад сляпнёў (Чыгр.). 6. Вярнуўшыся з гарадка, я от сабе, перад тым як сесці за працу, уключыў рэпрадуктар (Б.). 7. Меншы зубр гэта, відаць, была матка і зубраня перайшлі лясную дарогу і схаваліся ў гушчары (Хадк.). 8. Пасля вайны жыў адзін, калі не лічыць сабакі, да якога Чыгун такую мянушку зарабіў за жыццё Ігнат таксама не мае літасці і хоча звесці са свету, калі той пастарэў (У.Г.). 9. Два зборнічкі вершаў Улада Ініцкага Паўлюкоўскага, “Клім бабаю” і “Сон Гаўрылы”, трапіліся мне ўлетку 1934-га, а цяпер, выступаючы, нават прысвячэнне на адным з іх працытаваў па памяці (Б.). 10. Хата адусюль выдавала вясёлаю і радаснаю. Вокнаў было шмат усе сцены ў вокнах!, і таму нават з вуліцы адчувалася, як у ёй светла і ўтульна не толькі ў сонечнае, але і ў дажджлівае надвор’е (Я.С.). 11. Васнянікі гандляры насеннем кветак у польскія часы выстаўлялі на базар над сваімі доўгімі сталамі плакаты з надпісамі (Л.Д.). 12 З абмалотам ураджаем не так проста расстацца, пакінуць каму-небудзь (Сач.).

**4. Выпішыце спачатку сказы з устаўнымі канструкцыямі, якія маюць у сваім складзе злучнікі, а пасля сказы з устаўнымі канструкцыямі без злучнікаў. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Адкажыце, якую ролю адыгрываюць злучнікі ў складзе ўстаўных канструкцый.**

1. Калі надаралася вольная часіна а ўзімку ж, не сакрэт, селяніну крыху вальней, чым летам, выходзіў з хаты і падоўгу, пакуль холад не залазіў у валёнкі і пад кажух, стаяў ля сваёй хаты, проста стаяў і глядзеў, маўчаў (Я.С.). 2. Вёска то была Шыраеўка здалася Чубару ціхай (Чыгр.). 3. Амаль паўтараста двароў па шнуравой кнізе дакладна сто сорак тры патаналі ўначы, прыслоненыя да лесу, які ледзь не плакаў сваёй густой, нібыта чорная воўна, цемрай (Чыгр.). 4. Нарэшце здзейснілася запаветная мара Ігната Дуброўскага – напісаць дакументальную аповесць ці раман, як зазначыў сам аўтар пра аднаго з выдатных сыноў беларускага народа, вучонага, акадэміка Антона Раманавіча Жэбрака і яго паплечнікаў (У.Ю.). 5. Зубр сімвал запаведнага краю заўсёды быў гордасцю нашага народа (Парх.). 6. А дубкі цяпер гэта ўжо высокія, раскідзістыя дубы стаяць волатамі (З.П.). 7. Цікавую кнігу на простай і зразумелай роднай мове я чытаў і перачытваў многа разоў, насіў яе за пазухай, каля сэрца, пасучы карову ў полі, хаваў пад падушку, кладучыся спаць а раптам ды прападзе ўночы! (Гіл.). 8. Як бы само сабой забылася, што людзям у той час свет як і ва ўсе часы найбольш быў нешырокі, невялікі: гумно, хата, вуліца… (І.М.). 9. Дзеркачом абабіўшы валёнкі на працы быў дзесьці, ён [дзед] прысеў каля грубкі (Гіл.). 10. …Год трыста ён [дуб] яшчэ прастаіць, здаровы, поўны сіл стары. А да таго часу ягоныя суседзі і, напэўна, дзеці, трохі маладзейшыя за яго, стануць такія самыя, а тады, значыцца, і падаць можна (Каратк.). 11. Сваякі і на суседзяў шанцавала былі людзі спявучыя, вельмі музычныя, многія з добрымі галасамі, з апавядальным талентам… (Каратк.). 12. Я не ведаю ў славянскай і, магчыма, не толькі ў славянскай паэзіі такога гімна шчасцю, каханню, сонцу, вольнай працы на вольнай зямлі побач з любімым, блізкім табе чалавекам, як паэма “Яна і я” (Каратк.). 13. І нават здаецца ён [М.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Баграновіч] нам чымсьці далёкім-далёкім хаця і давеку блізкі, чымсьці такім, што даўно адышло ў нябыт хаця і грэе нас нязгаснымі промнямі сапраўднага генія (Каратк.).

**5. Прачытайце з адпаведнай інтанацыяй сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі. Спішыце, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку і растлумачце іх. Высветліце адрозненне ўстаўных канструкцый ад пабочных.**

I. 1. І небу як відаць не хацелася паверыць, што там, на зямлі, і сапраўды спакойна, бо яно зараз жа выслала з-за цёмнага краю зямлі яшчэ аднаго дазорцу – крывава-чырвоны баханец-месячык (К-с). 2. Спачатку праўда ўсе рэдактары лаяліся, што ў маіх “Каласах” зашмат сцэн палявання а гэта была спроба пазбавіцца ад неадчэпных праяў, спроба галоднага набіць рот тым, што пад руку трапіць, ад чаго смею спадзявацца мой чытач не дужа многа страціў (Каратк.). 3. Канечне рана-позна братам трэба дзяліцца, заводзіць сваю гаспадарку, але ці паразумеюцца яны мірна? (Дал.). 4. Вакол поле залатое бяскрайнее мора перакатваецца хвалямі, шапоча (І.М.). 5. Тут кажуць ёсць пад зямлёю знарок пракапаныя лёхі. У адну такую лёху наш Сівіца быў траха не праваліўся (Л.К.). 6. Спачатку праўда Марыля ўздыхнула з палёгкаю – дачка пайшла ў добрую, паважаную ў вёсцы сям’ю (З.П.). 7. Нават арабіну ў сваім кветніку не абірай дарэшты – хай крыху з’ядуць або абтрасуць на зямлю гэта запас на вясну, калі сыдзе снег, птушкі, якім яна магчыма паратунак (Каратк.). 8. Міхалевіч усё свядомае жыццё займаецца грыбамі, ведае іх як ніхто бадай (Парх.). 9. Стракатая сукенка пашыта відаць даўно: тонкія загарэлыя ногі дзяўчынкі здаваліся пад ёй залішне доўгімі (Б.). 10. Ануфрыеўскі манастыр заснаваны за тры гады да Грунвальда 1407 ягоным героем Лугвенам-Сямёнам Мсціслаўскім (Каратк.). 11. Расцярушаная па полі салома здавалася палае агнём (К.Ч.). 12. Скалісты, ззаду асветлены праменнем бераг быў стромы, як сцяна, высокі больш за дзвесце метраў (Б.).

II. 1. Мінск спрадвеку гэты горад называлі Менеск, Менск з 1918 года паступова пачынае асвойвацца з роллю сталіцы Беларускай рэспублікі (Э.Я.). 2. Дробны аднатонны рэльеф [маскоўскай кафлі] не глядзеўся здалёк. Зблізку, на ляжанцы або грубцы калі ласка разглядай колькі хочаш. На грубкі гэтая кафля пераважна і ўжывалася. Іншая справа кафля беларускіх мсціслаўскіх, копыскіх і інш. майстроў (Каратк.). 3. Пра дзейнасць Каліноўскага, якога Мураўёў-душагуб баяўся па яго ўласным прызнанні больш, чым нават паўстанцкіх атрадаў, Зміцер Жылуновіч Цішка Гартны чуў ад старых капылянаў яшчэ ў маленстве (Э.Я.). 4. Своеасаблівым помнікам барацьбітам раёна, жанчынам-партызанкам, з’яўляецца паэма ўкраінскага паэта М. Нагнібяды “Матулям з Расонаў” пераклаў А. Вялюгін, прысвечаная маці-патрыёткам і сярод іх – Дар’і Пятроўне Машэравай, закатаванай фашыстамі ў красавіку 1942 года (М.Б.). 5. Відаць ад слова “прыпеч” атрымала назву вялікая палеская рака Прыпяць (В.В.). 6. Трэба аднак сказаць, што “Новая зямля” не была чымсьці нечаканым ці выпадковым у беларускай літаратуры: беларускі раман у вершах з’явіўся творчым падагульненнем найбольш выдатным і манументальным усяго вопыту беларускага паэтычнага эпасу, пачынаючы ад “Тараса на Парнасе” (Адам). 7. Пачынала світаць. Панавала такая ціша, што здавалася чуваць, як спіць і лёгка дыхае возера (Дам.). 8. Галоўная праца І. Насовіча выйшла ў 1870 годзе, калі яму было 82 гады. Гэта “Слоўнік беларускай гаворкі” – “Словарь белорусского наречия” назва “Беларусь” на той час як вядома знаходзілася пад забаронай і ў насельніцтва гэтай зямлі ніякай такой мовы быць не магло. Існавала гаворка (Каратк.). 9. Як сведчаць некаторыя нашы даследчыкі напрыклад гісторык У. Якутаў толькі ў Беларусі за час яжоўска-берыеўскіх рэпрэсій 30-х гадоў знішчана каля двух мільёнаў чалавек (В.Б.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ